

# На чатырох франтах

Другі год грымелі жорсткія бai на савецкай зямлі. Другі год рваўся Якаў Сусько на фронт. Дзесяткі разоў ён падаваў рапарты і дзесяткі разоў атрымліваў лаканічны адказ:

— Рыхтаваць для фронту лётчыкаў — справа важная. Працуйце.

Сусько працаваў. Настойліва, цярпліва вучыў ён лётчыкаў, але ўсёй душой рваўся на фронт. Ён лічыў, што яго месца пад Сталінградам, дзе грымелі ярасныя бai на зямлі і ў паветры. Малодшы лейтэнант ведаў, што яго адпусцяць на фронт. Але калі гэта будзе?

І гэты дзень надышоў. У кастрычніку сорак



другога года Якава Сусько накіравалі ў вучэбны полк для перавучвання на самалёце-штурмавіку



ІЛ-2. Пасля вывучэння матэрыяльнай часткі і авалодання тэхнікай пілатавання накіравалі на фронт. Трапіў Сусько ў 996-ы штурмавы авіяцыйны полк 224-й авіядывізіі. Аднак у баявых дзеяннях полк пачаў удзельнічаць толькі ў лютым 1943 года.

Аэрадром палка знаходзіўся паблізу горада Калугі, і лётчыкі яго дзейнічалі ў аператыўным тыле праціўніка, наносячы штурмавыя ўдары па важных аб'ектах ворага. У тыя дні лётчык-штурмавік Якаў Сусько і здзейсніў свой першы баявы вылет у саставе звяна штурмавікоў на станцыю Спас-Дземенск. «...наша звяно знішчыла некалькі эшалонаў з войскамі і тэхнікай ворага, — піша ў сваіх успамінах Герой Савецкага Саюза Я. Я. Сусько. — Хаця гэта было першае баявое хрышчэнне, але гэты вылет быў вельмі эфектыўным — цэлы дзень па данясеннях разведкі, гарэлі эшалоны на станцыі».

За першым вылетам паследавалі другія. Экіпажу самалёта ІЛ-2 давялося штурмаваць і бамбіць ворага ў Людзінаве, наносіць удары па аэрадромах праціўніка ў Бранску, Олсуф'еве, Сешчы. На ўсё жыццё ў памяці Якава Ягоравіча застаўся налёт на аэрадром гітлераўцаў у Сешчы.

...Было гэта ў маі 1943 года. Аперацыя па знішчэнню самалётаў ворага на гэтым аэрадроме была задумана даўно. Яна рыхтавалася старанна, і для нанясення ўдара былі адабраны лепшыя экіпажы штурмавікоў. Добра ведаючы, што фашысты свой аэрадром у Сешчы прыкрылі вялікай колькасцю зенітнай артылерыі, лётчыкі павялі свае ІЛы на вялікай вышыні. Яны абыйшлі раён аэрадрома і з'явіліся на цэллю так непрыкметна і нечакана, што не ўспыхнуў ні адзін пражэктар, не адкрыла агонь ні адна зенітка. Першым уніз, на стаяўшыя на лётным полі «юнкерсы» і «хейнкелі», павёў свой штурмавік вядучы групы. За ім накіраваліся астатнія самалёты. Удар па Сешчынскаму аэрадрому быў не толькі раптоўным, але і моцным: група

ІЛаў знішчыла 20 варожых самалётаў, узарвала трапна скінутымі бомбамі рэзервуары з гаручым, і паспяхова вярнулася на сваю базу.

На другі дзень у паўторным налёце на Сешчу пайшло 24 штурмавікі. На гэты раз ім прыйшлося пераадольваць жорсткую агнявую заслону ворага. Ужо пры падыходзе да варожага аэрадрома лётчыкі зразумелі, што непрыкметна нанесці ўдар не ўдасца — вораг чакаў гэтага налёту, і лётчыкі павінны былі пераадольваць моцны загараджальны агонь зенітнай артылерыі, прарывацца скрозь строй «месершмітаў», паднятых у паветра для прыкрыцця аэрадрома. Каб выканаць заданне, частка штурмавікоў уступіла ў бой са знішчальнікамі ворага. Гэтым яны далі магчымасць астатнім ІЛам нанесці штурмавы ўдар па аэрадрому.

«У другім налёце на Сешчынскі аэрадром, — піша Я. Я. Сусько, — мой самалёт у паветраным баі і зенітным агнём быў моцна пашкоджаны — разбіта правае крыло, выведзена са строю сістэма выпуску шасі. Самалёт цяжка было ўтрымаць у гарызантальным палёце, а нямецкія знішчальнікі ўвесь час насядалі і атакавалі. Мне прыйшлося знізіцца да брыючага палёту, і толькі на фоне лесу немцы страцілі з поля зроку мой штурмавік. На свой аэрадром вярнуўся на разбітым самалёце, і сеў «на бруха», як у нас казалі, калі шасі нельга было выпусціць».

Калі пачалася бітва на Арлоўска-Курскай дузе, лётчыкі 996-га штурмавога авіяпалка сталі здзяйсняць па 4—5 баявых вылетаў на штурмоўку варожых войск, абарончых рубяжоў і падцягваемых да фронту рэзерваў і падмацаванняў. Для выканання гэтых палётаў прыходзілася лятаць у складзе групы і ў адзіночку. Адным ліпеньскім днём, калі жорсткія баі грымелі па ўсяму фронту, шас-



цёрка самалётаў ІЛ-2, у якой быў і Якаў Сусько, вылецела на знішчэнне варожага бронепоезда. На перагоне чыгункі Карачаў — Бранск лётчыкі знайшлі бронепоезд, і абрушылі на яго агонь гармат і кулямётаў, скінулі бомбы. Удар быў дакладным — фашысцкі бронепоезд быў знішчаны. За выкананне гэтага баявога задання Якаў Сусько атрымаў першую баявую ўзнагароду — ордэн Чырвонага Сцяга.

Бітва на Курскай дузе скончылася бліскучай перамогай савецкіх войск. Вораг панёс вялікія страты, але панеслі страты і савецкія войскі. Штурмавы авіяцыйны полк, у саставе якога змагаўся лётчык Сусько, з-за вялікіх страт у лётным саставе і матэрыяльнай часткі, быў адведзены пад Маскву на папаўненне. Пасля абучэння маладых лётчыкаў полк зноў быў перакінуты на фронт. У ходзе баявых дзеянняў ён уваходзіў у састаў Бранскага, Заходняга, 1-га і 4-га Украінскіх франтоў. На чатырох франтах сумесна з лётчыкамі 1-й, 15-й, 2-й і 8-й паветраных армій Якаў Сусько зрабіў нямала для знішчэння войск і тэхнікі ворага. У тыя дні ён вадзіў на выкананне баявых заданняў групы самалётаў. То Сусько ішоў на чале васьмёркі, то за ім ляцела 12 штурмавікоў. А былі дні, калі ён, ужо набыўшы ў баях немалы вопыт, уменне змагацца з ворагам, стаўшы смелым, умелым лётчыкам, вадзіў у палёт і 20 грозных ІЛаў.

У дні баёў за вызваленне Украіны, калі нашы войскі, знішчаючы на сваім шляху ворага, вызвалялі заходнеўкраінскія землі, давялося Якаву Сусько весці групу на штурмоўку аэрадрома фашыстаў у горадзе Станіславе (зараз — горад Івана-Франкаўск). Гэты налёт быў асабліва паспяховым — 40 варожых самалётаў спалілі і пашкодзілі на аэрадроме Сусько і яго таварышы па групе.



Жыццё кожнага лётчыка-штурмавіка на фронце было запоўнена цяжкай і небяспечнай баявой работай. Не паспяваў ён адпачыць пасля аднаго вылету, як даводзілася ўзлятаць у другі. У палётах і баявых клопатах праходзілі дні і тыдні. Усё далей і далей адыходзілі лётчыкі ад сваіх родных мясцін, і настаў дзень, калі яны прызямліліся ў Германіі. Там, у Германіі, на аэрадроме паблізу горада Гляйвіц, і сустрэў Якаў Сусько 9 мая 1945 года — Дзень Перамогі над гітлераўскім фашызмам. З гэтага чужога аэрадрома падняў свой ІЛ-2, каб прызямліцца на Украіне, каля горада Хмяльніцкага. Там Якаў Ягоравіч даведаўся, што Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 29 чэрвеня 1945 года яму прысвоена званне Героя Савецкага Саюза за паспяховае выкананне баявых заданняў, за 112 баявых вылетаў, за знішчэнне 11 самалётаў ворага на аэрадромах, 30 танкаў, 120 аўтамашын, 25 гармат, 27 мінамётных батарэй, 45 вагонаў і 2 цыстэрнаў, за тры ўзарваных масты, дзве разбураных чыгуначных станцыі.

Неўзабаве ў Крамлі М. І. Калінін уручыў Я. Я. Сусько, ураджэнцу вёскі Чарняўка Хоцімскага раёна, ордэн Леніна і Залатую Зорку. Узнагароды героя зазвалі побач з трыма ордэнамі Чырвонага Сцяга, ордэнамі Айчыннай вайны I ступені, Аляксандра Неўскага, побач з баявымі медалямі.

З 1946 года Герой Савецкага Саюза Я. Я. Сусько носіць цывільнае адзенне. Спачатку ён вучыўся, потым працаваў у Варонежскім абкоме партыі, а зараз — супрацоўнік Міністэрства замежных спраў СССР, жыве ў Маскве, часта выступае з расказамі аб мужнасці савецкіх лётчыкаў, якія храбра змагаліся з фашыстамі на франтах Вялікай Айчыннай вайны.

**М. САЛАЎЁЎ,**
старшы лейтэнант запасу. г. Мінск.

Салаўёў, М. На чатырох франтах / М. Салаўёў // Шлях Кастрычніка. — 1975. — 18 сакавіка. — С. 2, 3.